

# Татьяна Николаевна ВОЛЫНЕЦ

# Таццяна Мікалаеўна ВАЛЫНЕЦ

# Tatyana Nikolaevna VOLYNETS

Таленавіты педагог і навуковец, вядомы ў Беларусі і за яе межамі філолаг-русіст, спецыяліст па функцыянальнай граматыцы, лінгвістычным аналізе тэксту і лінгвадыдактыцы, доктар філалагічных навук, прафесар Таццяна Мікалаеўна Валынец 1 мая адзначыла сваё 70-годдзе.

Т. М. Валынец з'яўляецца ўраджэнкай г. Сямёнава Горкаўскай (зараз Ніжагародскай) вобласці Расіі. Яшчэ ў дзяцінстве разам з сям'ёй яна пераехала ў Беларусь, у г. Ліду, дзе ў 1971 г. скончыла сярэднюю школу. У тым жа годзе Таццяна Мікалаеўна стала студэнткай філалагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння навучання, у 1975 г., яна паступіла ў аспірантуру БДУ. Т. М. Валынец далучылася да лінгвістычнай школы выдатнага беларускага навукоўца П. П. Шубы і пад яго кіраўніцтвам абараніла кандыдацкую дысертацыю «Структура русской глагольной парадигмы» (1978). Пры напісанні доктарскай дысертацыі «Семантика и грамматика русского причастия в языковой системе» (1998) навуковым кансультантам таксама выступіў прафесар П. П. Шуба.

Працоўная біяграфія Таццяны Мікалаеўны пачалася ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі (1978–1979). У 1980 г. жыццё непарыўна звязала яе з філалагічным факультэтам БДУ. Т. М. Валынец пачала свой шлях як выкладчык кафедры рускай мовы, а ў 2000 г. яна стала працаваць на пасадзе прафесара. У 1987 г. Таццяне Мікалаеўне было прысвоена вучонае званне дацэнта, у 2008 г. – вучонае званне прафесара.

Т. М. Валынец неаднаразова прадстаўляла педагагічныя традыцыі БДУ на міжнародным узроўні. На працягу 2 гадоў яна выкладала рускую мову ў Інстытуце работнікаў транспарту г. Дрэздэна (Германія). У 2013–2018 гг. Таццяна Мікалаеўна штогод працавала ў якасці запрошанага прафесара ў Інстытуце неафілалогіі Паморскай акадэміі ў г. Слупску (Польшча), чытала лекцыі студэнтам і магістрантам філалагічнага факультэта.

Прафесар працуе ў такіх галінах навукі, як марфалогія і словаўтварэнне, а таксама займаецца даследаваннем пытанняў перакладу, мовы сродкаў масавай інфармацыі, узаемадзеяння моў у сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму, эвалюцыі нормы ў граматыцы і інш. Т. М. Валынец мае больш за 220 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфіі («Грамматический феномен причастия» (Мінск, 1998), «Русское причастие в системно-функциональном аспекте» (Саарбрукен, 2016) і «Наречие в поэтическом тексте: лексико-грамматическое своеобразие и художественно-изобразительные возможности» (Мінск, 2021; у суаўтарстве)). Шырокі дыяпазон даследчыцкіх інтарэсаў Таццяны Мікалаеўны адлюстроўвае тэматыка яе публікацый у айчынных і замежных выданнях, у прыватнасці прац «Окказиональное слово как проводник по социальной реальности» (Аламоўц, 2000), «Об эволюции причастных форм в грамматической системе русского языка» (Ольштын, 2001), «Поэзия грамматики» (Сімферопаль, 2003), «Категория безличности в поэтическом дискурсе» (Архангельск, 2004), «Этностереотипы и их отражение в языковом сознании белорусов» (Мінск, 2009), «О грамматическом своеобразии текстов русских эпиграмм» (Познань, 2010), «Художественная трансформация и актуализация имен прилагательных в тексте» (Слупск, 2011), «Семантика запрета и ее отражение в языках возможных миров» (Слупск, 2012), «Прагматика наречных лексем в поэтическом тексте» (Масква, 2016), «Языковая ситуация в Беларуси и ее отра-

жение в современном газетном тексте» (Лодзь, 2018),«О межтекстовом взаимодействии русского и белорусского языков» (Санкт-Пецярбург, 2019), «О конкуренции этнонимов *белорус – беларус* в коммуникативном пространстве Беларуси» (Слупск, 2022), «Функционально-семантическое микрополе безличности и его реализация в прозе И. А. Бунина» (Гродна, 2023), «Об эволюции нормы в сфере глагольного словообразования» (Брэст, 2024), «О трансформации и деформации языковых норм в современном медиатексте» (Гродна, 2024).

Значны этап у навукова-педагагічнай дзейнасці Т. М. Валынец складаюць даследаванні, прысвечаныя моўнай адукацыі ў пачатковай і сярэдняй школе. З удзелам Таццяны Мікалаеўны былі напісаны вучэбныя праграмы і новыя школьныя падручнікі па беларускай і рускай мовах, напрыклад выданні «Русский язык. Морфология: учебник для школ с углубленным изучением русского языка» (1994), «Беларуская мова: падручнік для 1-га класа школ з рускай мовай навучання» (1998), «Беларуская мова: падручнік для школ з рускай мовай навучання. 2 клас» (1999), «Беларуская мова: падручнік для школ з рускай мовай навучання. 3 клас» (2000), «Русский язык: учебник для 3-го класса школ с белорусским языком обучения» (2000), «Русский язык. Культура устной и письменной речи. Учебник для 6-го класса школ с русским языком обучения» (2003), «Русский язык. Культура устной и письменной речи. Учебник для 7-го класса школ с белорусским и русским языками обучения» (2020), «Русский язык. Учебник для 10-го класса (базовый и повышенный уровни) школ с белорусским и русским языками обучения» (2020) і інш. Настаўнікі Беларусі добра ведаюць Таццяну Мікалаеўну як спецыяліста па выкладанні марфалогіі рускай мовы, члена рэдакцыйнай калегіі рэспубліканскага навукова-метадычнага часопіса «Русский язык и литература», аўтара каля 30 падручнікаў для агульнаадукацыйных школ, а таксама 20 дапаможнікаў па рускай мове для студэнтаў-філолагаў, абітурыентаў, вучняў, настаўнікаў.

На працягу 10 гадоў прафесар кіравала секцыяй пачатковай адукацыі Вучэбна-метадычнага цэнтра пры Нацыянальным інстытуце адукацыі Рэспублікі Беларусь. Т. М. Валынец стаяла ля вытокаў стварэння часопіса «Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа» і з моманту яго заснавання (1997) выконвала абавязкі галоўнага рэдактара. У 2014 г. Таццяна Мікалаеўна стала лаўрэатам прэміі У. І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук як адзін з аўтараў вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай мове для 1–4-х класаў школ з рускай мовай навучання.

Т. М. Валынец з'яўляецца экспертам, які супрацоўнічае з Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў і штогод забяспечвае карэктнасць тэставых матэрыялаў для цэнтралізаванага экзамену па рускай мове. Акрамя таго, яна працуе ў прэзідыуме Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, дзе дбае пра якасць вучэбных выданняў для агульнаадукацыйных школ і ўстаноў вышэйшай адукацыі краіны.

На філалагічным факультэце БДУ Таццяна Мікалаеўна выкладае лінгвістычныя дысцыпліны «Марфалогія» (для студэнтаў-русістаў), «Мастацкі тэкст: лінгвастылістычны аспект», «Граматычная семантыка» і «Мова СМІ» (для магістрантаў спецыяльнасці «мовазнаўства»). Навуковыя працы яе вучняў неаднаразова займалі прызавыя месцы на рэспубліканскіх конкурсах.

Т. М. Валынец з'яўляецца ўдзельнікам шматлікіх міжнародных форумаў і канферэнцый па мовазнаўстве, у тым ліку такіх сусветна значных, як XI–XIV кангрэсы Міжнароднай асацыяцыі выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры. Яе працы ведаюць у краінах СНГ, Усходняй і Заходняй Еўропы. Таццяна Мікалаеўна і сама займаецца арганізацыяй навуковых мерапрыемстваў: на працягу 20 гадоў яна ўваходзіць у склад арганізацыйнага камітэта Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Руская мова: сістэма і функцыянаванне», якую праводзяць кожныя 2 гады ў БДУ. Акрамя таго, прафесар вядома ў Беларусі і за яе межамі як член рэдакцыйных калегій аўтарытэтных навуковых часопісаў «Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы», «Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова», «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія» і «Polilog».

Шмат гадоў Таццяна Мікалаеўна вядзе навукова-арганізацыйную працу, звязаную з падрыхтоўкай кадраў вышэйшай кваліфікацыі. У 2006–2015 гг. яна была вучоным сакратаром экспертнага савета Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Зараз Т. М. Валынец з'яўляецца членам 2 спецыялізаваных саветаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый пры БДУ, старшынёй навуковага семінара па папярэдняй экспертызе дысертацыйных даследаванняў па 3 спецыяльнасцях напрамку «філагічныя навукі» («беларуская мова», «руская мова» і «параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства»). Пачынаючы з 2000 г. пад кіраўніцтвам прафесара былі падрыхтаваны і паспяхова абаронены 9 кандыдацкіх дысертацый, у тым ліку праца аспіранта з Ірана.

Навуковая і педагагічная дзейнасць Т. М. Валынец была мнагакратна адзначана рознымі ўзнагародамі. Да іх адносяцца грамата Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР (1986), ганаровыя граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (1991, 2003), Ганаровая грамата Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі

Беларусь (2009), Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2015), нагрудныя знакі «Выдатнік адукацыі» (2005) і «Заслужаны работнік БДУ» (2014).

Прафесійнае майстэрства і высокая культура Таццяны Мікалаеўны спалучаюцца з найлепшымі чалавечымі якасцямі: інтэлігентнасцю, прыстойнасцю, добрасумленнасцю, справядлівасцю. Яе навуковая творчасць і майстэрства педагога складаюць гонар айчыннай лінгвістыкі і моўнай адукацыі, а таксама садзейнічаюць падтрымцы іх міжнароднага аўтарытэту.

Калектыў кафедры рускай мовы, калегі і вучні Таццяны Мікалаеўны сардэчна віншуюць яе з юбілеем і жадаюць моцнага здароўя, натхнення і творчых здабыткаў!

***І. С. Роўда*[1]*, І. Э. Ратнікава*[2]**

[1]*Иван Семенович Ровдо* – доктор филологических наук, профессор; заведующий кафедрой русского языка филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Іван Сямёнавіч Роўда* – доктар філалагічных навук, прафесар; загадчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Ivan S. Rovdo*, doctor of science (philology), full professor; head of the department of Russian language, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *rovdois@bsu.by*

[2]*Ирина Энгелевна Ратникова* – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры русского языка филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Ірына Энгелеўна Ратнікава* – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Irina E. Ratnikova*, doctor of scientce (philology), full professor; professor at the department of Russian language, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *ratnikova@list.ru*